# КАНДРАТ КРАПІВА – БАЙКАПІСЕЦ

**Мэты:** пашырыць уяўленні вучняў пра байку як жанр літаратуры, паказаць пераемнасць тэм, сюжэтаў, вобразаў у байках, створаных рознымі народамі ў розныя часы, раскрыць сэнс алегорыі ў байках К.Крапівы;
стварыць умовы для асэнсавання вучнямі творчай спадчыны Крапівы-байкапісца;
развіваць у вучняў уменне і навыкі выразнага чытання, аналізу алегарычнага твора, звязнага маўлення;
выхоўваць станоўчыя маральныя якасці вучняў.

**Абсталяванне:** падручнік па беларускай літаратуры, дошка, сшыткі па літартуры; зборнік з байкамі пісьменніка; выстава кніг К.Крапівы; партрэт пісьменніка.

**Эпіграф:** Ён - майстра. Больш таго, ён – чараўнік, якому прырода адкрыла запаветнае слова, здольнае тварыць цуды: рабіць волатам кволага, вяртаць упэўненасць знявераным, адкрываць вочы на праўду і крыўду. (С. Лаўшук)

**Ход урока**

**I. Арганізацыйны момант**

**II. Стварэнне эмацыянальнай атмасферы на ўроку**

**Настаўнік** **Слайд 1**

Добры дзень, паважаныя госці, добры дзень, дарагія сябры! Рада вас вітаць на сённяшнім уроку. Спадзяюся, што ў вас добры настрой. І з гэтым добрым настроем давайце з задавальненнем будзем сёння працаваць.

**III. Паведамленне тэмы, мэты ўрока**

**Настаўнік**

А прысвечаны наш урок творчасці К.Крапівы, як таленавітага, самабытнага байкапісца. Мы ўзгадаем з вамі асобныя старонкі з жыцця пісьменніка, пашырым нашы веды пра байку, прыгадаем вядомых творцаў байкі розных часоў і народаў, падрабязней спынімся на асобных байках пісьменніка.

На дошцы змешчаны выказванні вядомых пісьменнікаў і навукоўцаў пра К.Крапіву, ілюстрацыі мастакоў да яго найбольш вядомых баек, а таксама змешчана выстава з кніг байкапісца, якія вы пасля самі можаце ўзяць і прачытаць. Звяртаю вашу ўвагу на тое, што ў выставе прадстаўлены “Паэтычны слоўнік” Вячаслава Пятровіча Рагойшы, у якім даецца тлумачэнне мастацкім тропам, сродкам мастацкай выразнасці, асобныя з якіх мы будзем сёння ўзгадваць, прадстаўлены таксама і слоўнікі беларускіх прыказак і прымавак.

**IV. Падрыхтоўка да ўспрымання новай тэмы**

**Настаўнік**

А зараз вазьміце свае сшыткі, запішыце на палях сённяшнюю дату, тэму ўрока, пазначце гады жыцця пісьменніка. На працягу работы над тэмай вы будзеце самастойна запісваць асноўныя моманты.

На нашым уроку будуць працаваць вучні, якія папярэдне атрымалі заданне падрыхтаваць паведамленні. І зараз давайце паслухаем невялічкае выступленне пра жыццёвы і творчы шлях К.Крапівы.

***Вучань расказвае пра асноўныя моманты жыцця К.Крапівы*** **Слайд 2-6**

Кандрат Крапіва – гэта цэлая эпоха ў развіцці беларускай літаратуры. У гэтым годзе споўнілася роўна 120 год з дня нараджэння вядомага беларускага байкапісца і драматурга.

Нарадзіўся К.Крапіва 5 сакавіка 1896 года ў вёсцы Нізок на Уздзеншчыне. Вучыўся ў царкоўна-прыхадской школе, у гарадскіх школах у Стоўбцах і Койданаве. З 18 гадоў настаўнічаў.

А перад гэтым яшчэ хлапчуком, а пасля юнаком ён спазнаў усю сялянскую працу: умеў і араць, і касіць, і малаціць, і дровы вазіць, і кароў пасвіць. Веданне народнага жыцця, характару беларускага селяніна было жыватворнай крыніцай яго творчасці.

Пачалася Першая сусветная вайна. Крапіва скончыў школу прапаршчыкаў. Ваяваў на румынскім фронце. Быў камандзірам Чырвонай Арміі. У чэрвені 1941 г. служыць у якасці ваеннага журналіста ў франтавых газетах «Красноармейская правда» і «За Савецкую Беларусь». Быў таксама адказным рэдактарам газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», а пасля вайны – рэдактарам часопіса “Вожык”, дзе і друкавалася большая частка яго сатрычных вершаў і баек.

**Настаўнік** **Слайд 7**

К.Крапіва пражыў 94 гады. Ён пакінуў яркі след у беларускай літаратуры. Гэта пісьменнік, які прыйшоў з вёскі, які змагаўся за новыя адносіны паміж людзьмі, высмейваў адсталасць і забабоннасць, выкрываў п’янства, бескультур’е і іншыя чалавечыя недахопы. Як сказаў сам пісьменнік: **“Я хацеў умяшацца ў жыццё і тое-сёе ў ім паправіць”.**

Найбольш сатырычны талент К.Крапівы выявіўся ў байцы.

**V. Тлумачэнне новагу матэрыялу**

**Настаўнік**

А зараз давайце ўспомнім, што такое байка, з якіх частак яна складаецца. А таксама вызначым, якія прыёмы выкарыстоўваюцца для стварэння байкі.

***Выступленне вучня*** **Слайд 8**

**Байка –** кароткае вершаванае апавяданне, якое мае павучальны або выкрывальны характар.

Баяць – значыць расказваць розныя фантастычныя або неверагодныя гісторыі. У баечным сюжэце як правіла дзейнічаюць прадметы, рэчы, з’явы прыроды, жывыя істоты, якія надзелены чалавечымі здольнасцямі. Такі прыём называецца **алегорыя**.

Узнікла байка на сумежжы драмы і лірыкі. Нярэдка байку называюць маленькай сціслай драмай. Бо як і ў драме, у байцы на першае месца выступае напружанае канфліктнае дзеянне, у ёй маюцца дзеючыя асобы, часта сустракаюцца дыялогі, маналогі.

Байка ***кампазіцыйна*** звычайна складаецца з дзвюх частак:

1. апавядання (сюжэта);
2. вываду (маралі).

Мараль часцей даецца ў канцы байкі, але можа быць і ў пачатку.

Байка – жанр сатырычны, гэта значыць ёй уласцівы выкрывальны смех, дасціпнае адлюстраванне адмоўных з’яў.

Для стварэння сатырычнага эфекту ў байцы выкарыстоўваюцца ***гіпербала*** (перавелічэнне), ***іронія*** (затоеная, прыхаваная насмешка).

**Настаўнік** **Слайд 9**

Паслухайце, калі ласка, наступныя словы К.Крапівы і падумайце, пра каго ідзе гаворка.

“Хто не ведае гэтай руплівай і цікаўнай, з выгляду простай, але вострай на язык бабулі, якая можа расказаць забаўную гісторыю пра падзеі сярод звяроў, але мы пад гэтымі звярамі ўгадваем людзей, якіх добра ведаем у жыцці. Ёй да ўсяго ёсць справа: яна можа сунуць нос і туды, дзе яе не просяць, а пасля расказаць дзівосы, якія там бачыла, выставіць на смех нават таго, хто ўжо, апрача смеху, нічога не баіцца. Высмяяць, нягледзячы на асобы, тым больш, што ёй сапраўдных асоб і называць няма патрэбы: яна падасць гэта ў алегерычнай форме, дзе дзейнічаюць умоўныя персанажы – жывёлы або людзі.”

1. ***Дык пра якую бабулю гаворыць К.Крапіва?***
   *Пра байку*

2. ***А чаму К.Крапіва называе байку “бабуляй”?***
   *Таму што байка вельмі старажытная*

**Настаўнік**

А ці ведаеце вы, калі і як ўзнікла байка, хто стаяў ля вытокаў яе ўзнікнення?

***Выступленне вучня*** **Слайд 10**

Як жанр байка вельмі старажытная. Свае вытокі яна бярэ з вуснай народнай творчасці, калі людзі не ўмелі яшчэ пісаць і чытаць. А ўсё ж стваралі і перадавалі творы з вуснаў у вусны, з пакаленняў у пакаленне.

Прафесійнай байцы ўжо прыкладна 2,5 тысячы гадоў. Узнікла байка ў Старажытнай Грэцыі, а пачынальнік яе Эзоп, народны мудрэц, раб з Фракіі, які жыў на востраве Самас. Эзоп быў маралістам, таму што асноўная ідэя байкі сканцэнтравана заўсёды на маралі.

Змест яго баек цікавіў іншых пісьменнікаў, якія іх пераказвалі па-свойму. Лафантэн – выдатны французскі байкапісец, які жыў у XVII ст. Яго байкі былі напісаны ў вершаванай форме і высмейвалі мараль тагачаснага грамадства.

У рускай літаратаруты байка дасягнула выключна высокага ўзроўню ў творчасці Івана Андрэевіча Крылова. Набыла выразна акрэленыя рысы народнай творчасці і ўсеагульную любоў і прызнанне.

У беларускай літаратуры да жанру байкі звярталіся Францішак Багушэвіч, Альгерд Абуховіч, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. Аднак сапраўдным майстрам байкавага жанру з’яўляецца К.Крапіва. У яго творах ёсць усё тое, што характэрна для гэтага жанру: апавяднанне пра займальную падзею, мараль, гумар, вершаваная форма.

**Настаўнік** **Слайд 11**

Верш, які вы зараз паслухаеце, можа быць для вас падказкай пры адказе на наступнае пытанне: чаму Кандрат Кандратавіч Атраховіч абраў сабе такі незвычайны псеўданім – Крапіва. *(настаўнік выразна чытае на памяць верш).*

Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.

А якая – смех, дый годзе:
Я – пякучка-крапіва.
Я расту вось тут пад плотам
І не так даўно ўзышла,
А ўжо многім абармотам
Рукі-ногі папякла.
Хто палез за агуркамі,
Хай той носіць пухіры –
Мяне голымі рукамі
Асцярожна, брат, бяры.
Хто сустрэўся быў са мною,
Дакрануўся раз ці два,
Дык той ведае ўжо, хто я:
Я – пякучка-крапіва.

*(Псеўданім вельмі трапна і дакладна перадае адметнасць творчасці паэта і раскрываецца ў яго вершы: "Крапіва".*

*Сваё прызначэнне пісьменнік акрэсліў дакладна і лаканічна – апякаць абармотам рукі-ногі, гэта заначыць мастацкім словам змагацца супраць заган людзей і жыцця).*

**Настаўнік** **Слайд 12**

Сатырычныя творы К.Крапівы маюць не  толькі беларускае аблічча, яны гучаць на многіх мовах свету, у тым ліку на рускай і ўкраіннскай, польскай і чэшскай, балгарскай і венгерскай і іншых мовах свету.

Першая публікацыя мастацкага твора К.Крапівы ў друку – вершаваны фельетон, напісаны на рускай мове,  "Жили-были", які з'явіўся 13 красавіка 1922 г. у газеце "Красноармейская правда", а ў газеце "Савецкая Беларусь" 23 мая 1922 г. з'явіўся першы верш на беларускай мове "Сваты".

Да жанру байкі К.Крапіва звярнуўся ў 1922 г., калі пачаў пісаць па-беларуску. Аднак яго першая вядомая рэч "Воўк і Ягнюк па-новаму", створаная паводле байкі Івана Крылова "Воўк і Ягнятка", не вызначалася ні асаблівымі мастацкімі вартасцямі, ні ўвогуле выразнай задумай, таму ніколі аўтарам не ўключалася ні ў адзін зборнік. Затое байка "Волк і Авадзень", напісаная ў 1923 г., звярнула на сябе ўвагу і з'яўляецца цікавай для чытачоў і для даследчыкаў у наш час.

**Вучань чытае на памяць байку "Вол і Авадзень"**

**ВОЛ І АВАДЗЕНЬ**

Гарачым летнім днём
Вол з ворыва вяртаўся.
Напрацаваўся, аж хістаўся.
За ім жа куча аваднёў
Ляцела роем.
Вядома тут, з якім настроем
Ісці мог Вол:
Глядзеў сярдзіта навакол,
Махаў хвастом, круціў рагамі

І біў па чэраве нагамі.
— А, сябар!.. Добры дзень! —
Сказаў лісліва Авадзень,
Усеўшыся Валу на спіну: —
Як я цябе люблю! Які ты мілы!
Цябе я, сябар, да магілы
Ніколі не пакіну.
Я ўсюды за цябе пайду —
Ў агонь, і ў нетру, і ў ваду.
Цяпер жа вось да стойла давяду.
Але чаму такі ты злосны?
— Адстань, пракляты крывапівец!
І без цябе мне млосна,
Цябе ж я ведаю, паршывец! —
Сказаў сярдзіта Вол ў адказ.
Патом
Хвастом
Па спіне — раз! —
Зваліўся той, як сноп, далоў...
Нямала ёсць павадыроў,
Якія любяць люд працоўны
За тое толькі, безумоўна,
Што любяць яго кроў.
Прамоў тых здрадніцкі-ўрачыстых
Даволі чулі мы і ад фашыстаў.
Але яны даждуцца дня —
Змахнуць і іх, як Авадня.
***1923***

**Абмеркаваннне байкі**

1. Давайце дакажам, што прапанаваны твор гэта ёсць не што іншае як байка?
2. Якой тэме прысвечана байка?
3. У чым мараль гэтай байкі?

**Настаўнік** **Слайд 13**

Асаблівы росквіт Крапівы-байкапісца прыпадае на 1925-1929 гады, калі была напісана большая частка ды, бадай, і самых вядомых, папулярных яго твораў у гэтым жанры.

У 1927 г. выйшаў асобнай кніжкай зборнік “Байкі”. І ўжо тады пра Крапіву загаварылі не толькі як пра таленавітага, надзвычай адоранага байкапісца, але і як аўтара вельмі самабытных, менавіта беларускіх твораў.

У Крапівы сапраўдны талент бачыць смешнае там, дзе іншыя не бачаць. Без смешнага няма сатыры. **Мэта сатыры, як вызначыў сам Крапіва, выкрыць зло ў імя дабра.** Сутнасць сатыры, каб выстаўляць на смех адмоўныя з'явы жыцця.

**VI. Фізкультхвілінка** **Слайд 14**

На ўроку павінен быць час як для работы, так і для адпачынку. Надышоў такі час.

**VII. Інсцэніроўка байкі "Дзед і Баба" з наступным яе абмеркавннем**

**Настаўнік** **Слайд 15**

Я думаю, што вы звярнулі ўвагу на тое, што, дзякуючы сродкам мастацкай выразнасці, байка - выразны мастацкі твор. І наступная байка "Дзед і Баба" будзе прадстаўлена ў выглядзе інсэніроўкі.

1. ***Хто з'яўляецца галоўным героем байкі?***
   (Галоўныя героі Дзед і Баба)
2. ***Куды яны накіроўваліся і што паміж імі адбылося?***
   (Дзед і Баба ехалі на кірмаш, яны пасварыліся паміж сабою за тое, што Баба стала памагаць каню, седзячы на возе. Інак кажучы, яна займалася пустой справай. Сюжэт байкі нескладаны, і няцяжка зразумець, чаму конь не можа цягнуць воз: *"Баба ж тая – сем пудоў, Сама меней, важыць."* У байцы даецца характарыстыка і Каню: *"Конік з выгляду дарма, ды цягнуў ён слаба".* Сварка Дзеда з Бабай даходзіць да высокага напалу, і Баба злазіць з воза, пагражаючы Дзеду, што без яе дапамогі воз і з месца не скранецца. Але в наадварот: *"Каня, як чорт панёс"*.
3. ***У чым заключаецца камічнасць байкі?***
   (Сварка Дзеда з Бабай набывае камічны характар. Дзед абзывае Бабу дурной, а Баба Дзеда – Старым Ёлупнем.
4. **У чым заключаецца павучальны сэнс гэтага твора?**
   (Асноўная думка байкі ўзнікае тады, калі Баба злазіць з воза. Аўтарская мараль паказвае, што неабходна пазбаўляцца ад непатрэбных людзей, якія толькі гавораць, але на самой справе нічога не робяць, ад іх ніякой карысці.)

**VIII. Работа над байкай "Ганарысты парсюк"**

**Настаўнік** **Слайд 16**

Я думаю, што байкі "Вол і Авадзень", "Дзед і Баба"з'яўляюцаа арыгінальнымі творамі, не менш арыгінальным з'яўляецца і байка "Ганарысты Парсюк". *(Настаўнік выразна чытае на памяць байку).*

**ГАНАРЫСТЫ ПАРСЮК**

Бывае, праўда вочы коле...

Раз гнаў пастух свіней у поле.

Адзін вялізарны Парсюк,

Які абегаў вёску ўсю,

За раніцу абшнырыў завуголле,

Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем —
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвінак,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: — Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
Нязграбна гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб, Парсюк раз'юшан:
— Цераз цябе я чырванець прымушан!
Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Ды гэта ж — дэмагогія! —
Парсюк наш лаецца, не даравяць клянецца:
— І месца мокрага,— крычыць,— не застанецца!
Ты мой свінячы гонар закрануў! —
І так ён Падсвінака грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.
Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.
***1927***

**Настаўнік**

Давайце паглядзім, ці ўсе словы ў байцы для вас з’яўляюцца зразумелымі?

**Слоўнікавая работа** **Слайд 17**

1. Сажань – старая руская мера даўжыні, роўная 2,134 м.
2. Нязграбна – няўклюдна, няспрытна (неуклюже).
3. Хіб – пярэдняя частка хрыбта (у свіней, быкоў); поўсць або шчацінне на хрыбце.
4. Раз’юшан – разъярённость.
5. Прымушан – вынужден.
6. Дэмагогія – пустыя мнагаслоўныя разважанні.
7. Гонар – честь.
8. Пяць сажняў – 10,64 м.

**Абмеркаваннне байкі**

1. **Як аўтар паказвае галоўных героеў байкі “Ганарысты парсюк”? Якімі вы іх сабе ўяўляеце?**
   *(Вялізарны Парсюк, у якога на лычы бруд і маленькі ружовенькі Падсвінак).*
2. **Што ў паводзінах Парсюка выклікае смех?**
   *(Неадпаведнасць таго, як ён бегае па вёсцы, “абшнырвае” завуголле з важным выглядам, і таго, што ў яго на лычы бруд).*
3. **Як звярнуўся Падсвінак да Парсюка?**
   *(Звярнуўся да яго са словам “дзядзечка”)*
4. **Што так раззлавала Парсюка?**
   *(Парсюк увогуле агрэсіўна ставіцца да любой заўвагі, да любой крытыкі, а тут, што найболей крыўдна, яму сказалі праўду).*
5. **Якім паказаны Парсюк у аўтарскім успрыманні?**
   *(Самаўпэўненым, самазадаволеным, ганарыстым).*
6. **Якія словы найбольш смешна гучаць у яго лаянцы?**
   *(Слова **“дэмагогія”** – пустаслоўе, фразеалагізм “мокрага месца не застанецца”, якім ён пагражае Падсвінаку за зычлівую заўвагу.*
7. **Якім паўстае з байкі вобраз Падсвінака?**
   (Ён шчыры, крыху наіўны і прастадушны).
8. **Знайдзіце і зачытайце радкі, у якіх заключана мараль байкі.**
   *Парсюк не надта быў ахвочы*
   *Глядзецца праўдзе ў вочы.*
9. **Якія чалавечыя заганы выкрыў аўтар у гэтай байцы?**
   *(Ганарлівасць, пераацэнка самога сябе, нецярпімасць да любых заўваг, невуцтва, нахабства і жорсткасць).*

**X. Падагульненне і каменціраванне адзнак**

**Настаўнік** **Слайд 18**

К. Крапіва пражыў доўгае насычанае жыццё і пакінуў пасля сябе велізарную духоўную спадчыну. За свае амаль 95 гадоў ён напісаў звыш сарака баек. Многія з іх выраслі з народных прыказак і прымавак, а некаторыя сталі **крылатымі словамі**, якімі мы карыстаемся і зараз.

Поруч са славутым «свінтусам грандыёзусам» можна прыгадаць і гэтыя радкі з баек:
«Другі баран – ні „бэ“, ні „мя“, а любіць гучнае імя».
«Аднак жа, як свінню не кліч, яе заўсёды выдасць лыч!»
«Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах».
«Малому веліччу быць хочацца заўсёды».
«Парсюк не надта быў ахвочы глядзецца праўдзе ў вочы».
«Прэтэнзій у яго – хапіла б на слана, заслуг жа – як у зайца».
«Каб Сонца засланіць – вушэй асліных мала».

Я думаю, што пасля вывучэння сённяшніх баек пісьменніка вы будзеце думаць над сваімі ўчынкамі і паводзінамі, для таго, каб аднойчы не ўбачыць сябе сярод адмоўных героеў баек. А закончыць урок мне хацелася б словамі Сяргея Лаўшука, даследчыка творчасці К.Крапівы:

**Слайд 19**

“ Ён - майстра. Больш таго, ён – чараўнік, якому прырода адкрыла запаветнае слова, здольнае тварыць цуды: рабіць волатам кволага, вяртаць упэўненасць зняверанаму, адкрываць вочы на праўду і крыўду.”

Сёння з вамі мы папрацавалі добра і пацверджаннем гэтаму з’яўляюцца вашы адзнакі (настаўнік каменціраує выстаўленне адзнак).

**XI. Рэфлекія**

А наколькі добры ў вас настрой ад сённяшняга ўрока, ці ўсё для вас было зразумела, я прапаную вам адзначыць наступным чынам: перад вамі на сталах ляжыць тры кветачкі рознага колеру. Ваша задача прычапіць тую кветачку, якая адпавядае вашаму настрою ад сённяшняга ўрока:

***чырвоная*** – урок спадабаўся, усё было цікава і зразумела;
***сіняя*** – урок спадабаўся, але штосьці засталося незразумелым;
***жоўтая*** – урок не спадабаўся, усё было нецікавым і незразумелым.

А зараз давайце паглядзім, які ж букет у нас атрымаўся.

Шчыра дзякую, мае сябры, за адказную працу. Мне хацелася б, каб гэты ўрок не прайшоў для вас бясследна.

**XII. Дамашняе заданне**

1. Вывучыць на памяць байку К.Крапівы “Ганарысты парсюк”;
2. Скласці сінквейн (па жаданні).